Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа № 15 горада Магілёва”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
# “ПРЫЁМЫ ЗАСВАЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКІ ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ МАТЫВАЦЫІ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

Сямёнава Алена Аляксандраўна,

настаўнік пачатковых класаў

8(029)25-17-991

e-mail: selena.72@mail.ru

**1. Інфармацыйны блок**

**1.1. Тэма вопыту**

Прыёмы засваення беларускай лексікі для павышэння матывацыі вывучэння беларускай мовы

**1.2. Актуальнасць вопыту**

У апошнія гады родная мова беларусаў стала дзеля іх другой замежнай мовай, незразумелай, мала ўжывальнай. Часам здаецца, што “матчына мова” рызыкуе паўтарыць лёс лацінскай мовы на сваёй роднай зямлі. Практыка шматгадовай работы паказвае, што з кожным годам вучні праяўляюць усё менш цікавасці да яе вывучэння. Доказ таму выказванне вучня-першакласніка, які толькі пачаў вывучаць беларускую мову: “Беларуская мова никому не нужна. Зачем её учат, если не ней никто не разговаривает?” У маёй практыцы не было вучняў, якія б да школы раслі ў беларускамоўных сем’ях, ніхто з іх не ведаў ні вершаў, ні песень па-беларуску. На бытавым узроўні мы амаль не чуем сапраўднай беларускай мовы, якая па мілагучнасці лічыцца другой у свеце пасля італьянскай . Часцей гучыць грубая, непрыемная “трасянка” . Таму перад настаўнікам, у першую чаргу пачатковых класаў, стаіць вельмі важная задача: прывіць цікавасць да роднай мовы, паказаць яе хараство, сакавітасць, мілагучнасць, улюбіць дзіцяці ў мову сваіх продкаў, каб разам з роднай мовай мы не страцілі сваю нацыянальную годнасць.

Лічу, што зрабіць гэта можна, выкарыстоўваючы розныя спосабы знаёмства з родным словам. З ранняга дзяцінства слова ўваходзіць у жыццё чалавека, адкрывае новае і тлумачыць вядомае, спрыяе разуменню законаў жыцця і прыроды, дапамагае выхоўваць характар, вучыць жыць. Звычка ўнікаць у сэнс слова, якую набываюць дзеці менавіта на пачатковай ступені навучання, часта адыгрывае вырашальную ролю ў станаўленні асобы і моцна ўплывае на ўвесь яе далейшы духоўны рост. Значыць, перад настаўнікам стаіць вельмі важная і нялёгкая задача — дапамагчы вучням авалодаць роднай мовай, навучыць іх правільна і дакладна карыстацца яе неацэнным лексічным багаццем, размаўляць і думаць на ёй з асалодай.

Галоўная ўмова паспяховага засваення роднага слова — выпрацоўка ў вучняў умення вызначаць агульны яго сэнс на аснове лексічнага значэння кораня. Такое ўменне стыхійна не ствараецца, яго неабходна настойліва і крапатліва фарміраваць ужо з першага класа, выкарыстоўваючы пэўныя метадычныя прыёмы. Выхаванне цікавасці да слова, развіццё ў дзяцей імкнення самастойна зразумець яго на аснове агульнасці кораня, а таксама групы аднакаранёвых слоў ці кантэксту — гэтыя прыёмы, як пацвярджае практыка школы, можна лічыць найбольш эфектыўнымі і дзейснымі.

### 1.3. Мэты і задачы педагагічнай дзейнасці

**Мэта** педагагічнай дзейнасці – фарміраванне цікавасці да роднай мовы, узбагачэнне лексічнага запасу вучняў, развіццё творчых здольнасцей, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці.

**Задачы:**

1) зацікавіць вучняў вывучэннем роднай мовы праз стварэнне пэўнай псіхалагічнай атмасферы, нацыянальнага моўнага асяроддзя на ўроку;

2) стварыць умовы для пашырэння слоўнікавага запасу вучняў праз шматэтапнае знаёмства з новым словам, пошук роднасных сувязей, сінанімічных і антанімічных адносін, высвятленне мнагазначнасці слоў, іх прамога і пераноснага значэння, а таксама падбор і завучванне пэўнага лексічнага матэрыялу , правядзенне лексічных хвілінак (гульняў);

3) стварыць умовы для далейшага развіцця звязнай мовы і творчых здольнасцей вучняў праз складанне загадак, чыстагаворак, дыялогаў.

### 1.4. Працягласць работы над вопытам

Я звярнула ўвагу на тое, што сітуацыя з вывучэннем роднай мовы няпростая чатыры гады таму, калі мае вучні прыйшлі ў першы клас і на ўроках беларускай мовы трэба было не толькі слухаць казкі на роднай мове і разумець агульны змест, але і правільна вымаўляць гукі і словы, на роднай мове , складаць сказы па малюнку, звязна выказаць сваю думку. Дзеці не толькі не маглі выказаць сваю думку ці скласці сказ, але нават не маглі арфаэпічна правільна паўтарыць за настаўнікам слова па-беларуску. Таму для мяне гэтая

праблема стала актуальнай. Я пачала мэтанакіравана працаваць над пашырэннем слоўнікавага запасу вучняў.

## 2. Апісанне тэхналогіі вопыту

### 2.1. Вядучая ідэя вопыту

Вядучая ідэя вопыту заключаецца ў стварэнні ўмоў, калі вучні пападаюць пад уплыў нацыянальнага моўнага асяроддзя, і калі праз сувязь пачуццяў, эмоцый, цікавасці да аўтэнтычных моўных выразаў фарміруецца асэнсаваная зацікаўленасць роднай мовай, нацыянальнай культурай, самабытнасцю. Акцэнт робіцца на тое, каб данесці да дзяцей, што іх родная мова незвычайна мілагучная, гаваркая, трапная. Нават гукавое афармленне слова можа больш дакладна раскрыць нам яго сэнс.

### 2.2 Сутнасць вопыту

На першым этапе - вуснага знаёмства з роднай мовай - работа будавалася па наступным плане:

1. работа над правільным гукавымаўленнем: шматразовае паўтарэнне вывучаемага гука, слоў з гэтым гукам, чыстагаворак з гэтым гукам;
2. слуханне жывой беларускай мовы: праслухванне ў аўдыёзапісу беларускіх песень, казак, вершаў;
3. завучванне на памяць твораў малых жанраў: лічылак, скорагаворак, вершаў, песенек, загадак;
4. гутаркі па карцінках, калі вучні будуюць адказ, выкарыстоўваючы словы з пытання настаўніка;
5. работа па назапашванню, пашырэнню і ўзбагачэнню лексічнага запасу: складанне тэматычнага слоўніка;
6. тлумачэнне значэння слова шляхам паказу і перакладу;
7. складанне дыялогаў з вывучаемымі словамі;
8. выкарыстанне дыдактычных гульняў “Перакладчыкі”, “Чароўная скрыначка”.

На другім этапе (у другім класе) мы працягнулі работу па пашырэнню слоўнікавага запасу і развіццю арфаэпічна правільнага звязнага вуснага маўлення:

1.чытанне твораў на беларускай мове, з арфаэпічна правільным вымаўленнем слоў па-беларуску;

2. складанне дыялогаў з дадзенымі словамі або дыялогаў на пэўную тэму;

3.выкананне пісьмовых практыкаванняў, адной з мэтаў якіх з’яўляецца ўзбагачэнне моўнага запасу вучняў;

4.будаванне вуснага адказу на пытанні па змесце прачытанага;

5. складанне сказаў па малюнку;

6. тлумачэнне значэння незнаёмага слова з дапамогай кантэксту.

На трэцім этапе (у трэцім і чацвёртым класах) заданні насілі больш развіццёвы характар:

1. складанне апавядання па малюнку, серыі малюнкаў з апорай на дадзеныя словы і словазлучэнні;
2. параўнанне лексічных з’яў у рускай і беларускай мовах;
3. вусныя і пісьмовыя пераклады з рускай мовы на беларускую і з беларускай – на рускую;
4. тлумачэнне сэнсу слова з дапамогай тлумачальнага слоўніка, а таксама выкарыстоўванне прыему шматэтапнага знаёмства з новым словам;
5. выкарыстоўванне прыёму пошуку роднасных сувязей, сінанімічных і антанімічных адносін, высвятлення мнагазначнасці слоў, іх прамога і пераноснага значэння.
6. тлумачэнне сэнсу фразеалагічных зваротаў.

У сваёй практыцы я вызначыла наступныя напрамкі работы:

✔ стварэнне пэўнай псіхалагічнай атмасферы і нацыянальнага моўнага асяроддзя на ўроку праз выкарыстанне лепшых фальклорных і аўтарскіх твораў, адпаведнай нагляднасці;

✔ падбор “лексічнай тэмы” - пэўнага лексічнага матэрыялу , які б адпавядаў тэме ўрока і суадносіўся з тэкстамі практыкаванняў падручніка;

- ✔ шматэтапнае знаёмства з новым словам;
- ✔ правядзенне “лексічных хвілінак”.

Як вядома, складанне добразычлівай эмацыянальнай атмасферы на ўроку спрыяе актывізацыі псіхічных працэсаў, падтрымлівае ў вучняў цікавасць да вывучаемага матэрыялу, фарміруе пазітыўную вучэбную матывацыю, а таксама вучні менш стамляюцца на ўроку. Псіхалагічны настрой – гэта энергетычны зарад, які рыхтуе эмацыянальную сферу дзіцяці да ўспрымання тэмы . Таму я пачынаю ўрокі з вершаў пра нашу мову, Радзіму, цікавых выказванняў, пажаданняў, уключаю ў структуру ўрока лепшыя фалькларныя і аўтарскія творы, якія б дзеці ўспрымалі не толькі розумам, але і сэрцам, адчуваючы прыцягальную сілу роднага слова. (Дадатак 1)

Я лічу, што трэба з першых урокаў інтэнсіўна назапашваць лексічны матэрыял. “Дзеці шасці гадоў вельмі здольныя да мовы, асабліва да роднай. Трэба як мага хутчэй рэалізаваць тую генетычную спадчынную праграму, якая закадзіравана ў кожным маленькім чалавеку самой маці-прыродай”. [1, с. 7]

З першых урокаў мы пачынаем складаць свой “Тэматычны слоўнік” , куды ўваходзяць наступныя групы слоў: ветлівыя выразы, школьныя прылады, прадукты харчавання, садавіна, гародніна, сваякі, мэбля, прылады асабістай гігіены, прылады працы, надвор’е, адзенне, абутак, звяры, птушкі, насякомыя, кветкі, дрэвы, грыбы, дзіцячыя гульні, святы і іншыя. У другім, трэцім і чацвёртым класах гэтыя групы дапаўняюцца новымі словамі. Гэта ўжо не толькі назоўнікі, якія абазначаюць пэўныя прадметы, але і прыметнікі, якія могуць абазначаць стан чалавека, яго рысы характару, настрой, а таксама дзеясловы, прыслоўі, лічэбнікі і пабудаваныя выразы з імі. Вывучаныя словы паўтараюцца і паступова пераходзяць у актыўны слоўнік вучняў. (Дадатак 2)

Новае слова – гэта і новыя веды. Тлумачэнне слова – гэта першы этап у працэсе ўзбагачэння слоўніка вучняў. Патрэбна паслядоўная, гібкая, пастаянная работа над словам. “Чым большай колькасцю аналізатараў успрымаецца слова, тым яно лепш запомніцца дзецьмі. Пагэтаму трэба, каб у засваенні слова прымалі ўдзел і зрок, і слых, і рука, і памяць, і, канечне, асмысленне.” [4, с.6].

Лічу, што для азнаямлення з новым паняццем лепш за ўсё спачатку прыслухацца да слова, каб паспрабаваць уявіць, што яно абазначае – сапраўдны беларус адчуе на генетычным узроўні, які сэнс укладалі яго продкі ў гэтае паняцце. Са словамі іншамоўнага паходжання такога не адбываецца. Гэта доказ таму, якая беларуская мова гаваркая. Прыслухайцеся хаця б да такіх слоў, як шэрань, адліга, завіруха, вясёлка – яны гавораць за сябе самі. Калі гэта магчыма, можна прадэманстраваць прадмет, даць дакрануцца да яго альбо разгледзець прадметныя карцінкі. Напрыклад, слова “ланцужок” .

- Прыслухайцеся да слова. Што вы чуеце? (Яно звініць.)
- Нездарма беларускі народ даў такую “звонкую” назву гэтаму прадмету. (Паказваю ілюстрацыю) Ён сапраўды можа звінець .
- Паглядзім у слоўнік. Якія яшчэ значэнні мае гэтае слова?
- Падбярыце аднакарэнныя словы: ланцуг, ланцуговы.
- Складзіце сказ з гэтым словам.

Такім чынам, у працэсе работы склаўся наступны алгарытм <u>шматэтапнага знаёмства са словам:</u>

- успрыманне слова на слых;
- уяўленне, што яно можа абазначаць;
- паказ ілюстрацыі або звяртанне да перакладнога і тлумачальнага слоўнікаў;
- падбор аднакарэнных слоў, сінонімаў, антонімаў;
- творчае прымяненне ў кантэксце.

“Лексічныя хвілінкі”, якія я таксама пачала ўводзіць у структуру ўрока, прысвечаны ўзбагачэнню і актывізацыі лексічнага і фразеалагічнага запасу вучняў. Яны займаюць да пяці хвілін кожнага камбінаванага ўрока. Гэта сістэма маўленчых гульняў. Правадзімая лексіка-фразеалагічная работа ўключае заданні практычнага характару, якія падаюцца ў цікавым для дзяцей фармаце. Пры іх выкананні вучні павінны самастойна рашаць розныя разумовыя задачы: апісваць прадметы, адгадваць іх па апісанню, па прыкметах падабенства і адрознення, групаваць прадметы па прыкметах і ўласцівасцях, знаходзіць

алагізмы, авалодаць аперацыямі аналізу, сінтэзу, абагульнення, абстрагавання пры рабоце са схемамі і мадэлямі.

А таксама дзеці вучацца супастаўляць лексіка-семантычнае значэнне каранёў розных слоў, адчуваць сэнсавае адценне кожнага слова. Тут вучні могуць паспяхова прымяніць назапашаную лексіку. (Дадатак 4)

Напрыклад:

*1.Гульня "Знайдзі чацвёртае лішняе"* дапамагае вучням аднавіць у памяці лексічнае значэнне кожнага слова і прымяніць лагічную аперацыю класіфікацыі: снежань, студзень, люты, злосны; крумкач, шпак, шчупак, грак.

*2. Гульня "Слова заблудзілася"* вучыць уменню знаходзіць сярод сугучных слоў словы з агульным коранем: рачушка, рачны, ракі, рака; казка, казаць, каза, расказваць.

*3. Гульня "Замяні адным словам"*вучыць хутка знаходзіць слова па яго лексічным значэнні. Гэту гульню можна праводзіць як спаборніцтва паміж камандамі, хто больш назаве слоў за адну хвіліну:

-аладка, блін з дранай бульбы - ________ ,

- знак для абазначэння ліку - _______ ,

- даглядчык, ахоўнік лесу -______ і г.д.

*4. Гульня "Лятае-не лятае"* развівае фанематычны слых. У гэтай гульні варта выкарыстоўваць словы, блізкія па гучанню: сініцы, суніцы, верабей, вавёрка, ластаўка, лаўка, казуля, зязюля, цяцера, сякера.

*5.Гульня "Так ці не?"* вучыць хутка знаходзіць рода-відавыя адносіны паміж паняццямі: Нара - гэта дрэва? Рыс – гэта расліна? Рух – гэта жывёла?

*6. Гульня "Замяні слова"* вучыць знаходзіць у сказах алагізмы і замяняць іх патрэбнымі словамі з "Тэматычнага слоўніка".

Хутка бегаюць воўк, конь, алень, <u>чарапаха</u>, страус. (Дзеці замяняюць слова "чарапаха", напрыклад, словам "заяц" або "сабака").

*7.Гульня "Адзін - многа" , "Многа-адзін"*

У беларускай і рускай мовах ёсць шмат назоўнікаў, якія ў адзіночным ліку гучаць аднолькава, а ў множным ліку адрозніваюцца канчаткамі і націскнымі

складамі: стог – стагі, снег – снягі. У гэтай гульні мэтазгодна звярнуць увагу на назоўнікі, род якіх у беларускай і рускай мовах не супадае: таполі – тополя, залы – зала і г. д. Можна ўключыць словы, якія маюць толькі форму множнага ліку : нажніцы, вароты, абцугі і г. д.

*8.Гульня "Адзін - некалькі"* вучыць правільна дапасаваць назоўнік да лічэбніка: вішня – 5 вішань, 3 вішні; стол – 2 сталы, 6 сталоў; сабака – два сабакі, 7 сабак; люстэрка – два люстэркі , пяць люстэркаў, цукерка – 2 цукеркі, 5 цукерак; грыб -7 грыбоў, два грыбы.

*9.Гульня "Хто такі ці што такое?"* вучыць пазнаваць па апісанню прадмет ці самому апісваць яго па істотных прыкметах: прыгожая, духмяная …(кветка), тонкае, празрыстае …(шкло). Працягам гэтай гульні на больш творчым узроўні можна лічыць самастойнае складанне загадак-апісанняў прадметаў па істотных уласцівасцях. Напрыклад: Белы, мяккі і пушысты. Для нас халодны, а для раслін – не. (Снег) Носіць на сабе шмат іголак, але нічога не шые. (Вожык) З рагамі, але не каза, з калёсамі, але не машына. (Тралейбус) і г. д.

### 2.3. Рэзультатыўнасць і эфектыўнасць вопыту

У выніку сістэматычнай работы па засваенню лексікі значна павысілася цікавасць вучняў да роднай мовы. Гэта праявілася ў тым, што вучні пачалі чытаць дзіцячую літаратуру на роднай мове, з задавальненнем гуляюць у беларускія гульні, ведаюць вершы, казкі, лічылкі на роднай мове. Лексічныя гульні дапамагалі пераадольваць цяжкасці разумовай працы. Тыя вучні, у якіх намячаўся страх і непрыязнь да беларускай мовы, нават і не заўважылі, як пачалі чытаць і гаварыць па-беларуску. Дзякуючы паступовай рабоце па ўзбагачэнню лексічнага запасу, вучні з мінімальным выкарыстаннем слоўніка перакладаюць тэксты з рускай мовы на беларускую і, наадварот, нават самі сачыняюць невялічкія апавяданні, казкі, загадкі, чыстагаворкі на роднай мове, карыстаючыся словамі і выразамі з нашага "Тэматычнага слоўніка". Павысілася агульная пісьменнасць вучняў па прадмету "Беларуская мова": сярэдні бал у 2021/2023 навучальным годзе складаў 7,7, а ўжо ў 2022/2023 навучальным годзе – 8,1. 30% вучняў удзельнічалі ў 2022/2023 навучальным годзе ў

рэспубліканскім конкурсе “Буслік”, дзе вучаніца, Чупіліна Мілана, заняла прыз 1 ступені . У гарадской алімпіядзе па беларускай мове вучаніца Шэіна Віялета ўзяла дыплом 3 ступені. Апытанне паказала, што 61% вучням падабаецца, калі яны гавораць на роднай мове, 78% вучняў лічаць сваю мову мілагучнай, прыгожай, ім падабаюцца беларускія песні; 50 % апрошаных дзяцей сказалі, што размаўлялі б на роднай мове кожны дзень, калі б усе на ёй размаўлялі, і было б з кім гаварыць, 72% вучняў сказалі, што адчуваюць сябе беларусамі толькі калі гавораць на роднай мове, лічуць, што дзеці павінны вывучаць і ведаць, не забываць мову сваіх продкаў, таму што яна наша, і без беларускай мовы беларусы – не беларусы. (Дадатак 5)

## 3. Заключэнне

Такім чынам, уключэнне дзяцей у беларускамоўнае асяроддзе, выкарыстанне цікавага матэрыялу пры правядзенні лексічных гульняў, падбор лексічных тэмы да асноўнай тэмы ўрока, складанне “Тэматычнага слоўніка” і далейшае выкарыстанне яго ў рабоце, уключэнне дзяцей у творчую дзейнасць паказалі сваю эфектыўнасць для павышэння матывацыі вывучэння роднай мовы. Надалей плануецца разам з вучнямі скласці свае слоўнікі сінанімічных і антанімічных радоў, слоўнік фразеалагічных зваротаў, якія б дапамагалі пашыраць і паглыбляць лексічны запас, каб вучні маглі назіраць за рознымі адценнямі слоў у сказах.

Урок з выкарыстаннем прыведзенага вопыту па тэме “Галоўныя члены сказа”, 3 клас, быў надрукаваны ў часопісе “Пачатковая школа” № 9 за 2013 г. (Дадатак 3)

## Спіс літаратуры

1. Сторажава, Н. А. Мова твая мая і твая: Вучу дзяцей па беларуску/ Н. А. Сторажава. – Мн.: Выд. А. Ванін, 1993. – 80 с.
2. Верашчака, Г. І. Лексічная работа на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах/ Г. І. Верашчака. – Мінск, 1978. – 203 с.
3. Кавалеўская, Н. І. Займальны матэрыял па навучанню грамаце ў 1 класе/ Н. І. Кавалеўская. – Мн.: ТАА “Авітон”, 1993. – 114с.

4. Ляшчук, В.М. І прарастаюць словы/ В. М. Ляшчук. - Мінск.,1989– 208 с.
5. Паўлоўская, В.І. Мова: цікава і займальна /В. І. Паўлоўская. – Мн.: “Народная асвета” , 1989. – 221 с.

**Дадатак 1**

***Матэрыял для стварэння пэўнай псіхалагічнай атмасферы***

***і нацыянальнага моўнага асяроддзя на ўроку***

О дзень вясёлы, шматгалосы,
Ідзеш ты шпаркаю хадой,
Пашлі мне ясныя нябёсы
І рэчку з цёплаю вадой.
Пашлі мне новы дзень, удачу,
Шчаслівым быць зусім не грэх.
І не даводзь мяне да плачу,
І прынясі сягоння смех.
Хачу, каб сон мой добры збыўся,
Каб я юлінцоў наеўся ўсмак,
Ні з кім не біўся, не свараўся,
Не пудзіў кошак і сабак.
Хай будзе ў нас навокал згода,
Усцешыцца мая радня,
Хай будзе між людзьмі лагода
І запануе дабрыня. *М. Дукса*

Куточак беражы ад куль,
Святы куточак свой, адзіны,
Бо ты і сам жывеш, пакуль
Жыве з табой твая Радзіма. *Мікола Шабовіч*

О, Беларусь, куточак гожы,
З табой я ў шчасці і ў журбе.
Ты без мяне заўсёды зможаш,
А я ніколі без цябе. *Аркадзь Нафрановіч*

Без мудрасці і без добрых звычаяў немагчыма жыць годна людзям на зямлі.

*Францыск Скарына*

Сто разоў шукай другой красы,
А тым больш што свет даўно не вузкі!

…Ды калі ты не бязродны сын –
Гавары са мной па-беларуску. *Яўгенія Янішчыц*

Шчасця большага няма ў зярняці,
Як на ніве роднай прарастаці. *В. Таўлай*

Паплыло паводкаю, загуло, як вецер,
Слова беларускае па вялікім свеце. *Янка Купала*

Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
маё, беларускае, роднае, кроўнае,
такое раптоўнае, такое чароўнае.
Такое ласкавае , цёплае, чыстае, як сонца, агністае,
як Нёман празрыстае,
як казка, быліна,як песня, жаданае,
дагэтуль зусім у жыцці не пазнанае, вясновае слова
*Д. Бічэль-Загнетава*

Калі ласка! …- нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы. *Пятрусь Броўка*

Як валошка ў сінім вяночку,
Кропля светлая ў ручаёчку,
Ты-праўдзівае і пяшчотнае
Слова матчына ў кожным радочку. *Ніна Тарас*

Блакіт нябёс і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус…
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я – хлопчык – беларус. *С. Сокалаў-Воюш*

Няма Радзімы без бацькоўскай хаты;
Бусліны клёкат – гэта родны дом;
Ты будзеш жыць шчасліва і багата,
Калі над хатай – буслава гняздо. *Пімен Панчанка*

Што такое Бацькаўшчына, знаеш?

Гэта рэчка, сцежачка лясная,
Гэта ў лузе залатая пчолка,
А ў вачах тваіх – вясёлка.
Бацькаўшчына – гэта дом твой, школа,
Гэта песні, што звіняць наўкола.
Гэта тата твой і мама,
І сябры твае таксама. *А. Касценка.*

Мая Айчына – поле, нівы,
Над Нёманам зялёны гай,
Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы –
Уся Беларусь ад краю ў край. *Пятрусь Броўка.*

Між лясамі і азёрамі –
Васільковыя палі…
Я не ведаю, не ведаю
Прыгажэшае зямлі. *Васіль Жуковіч*

Радзіма ў нас бязмежная,
Спякотная і снежная.
Радзіма ў нас лагодная,
Нібы матуля родная. *Артур Вольскі*

Пахне збожжа свежым хлебам.
Сыпле золата жніво.
Жаўрукі звіняць пад небам –
Славяць свету хараство.
На бярозе - белы бусел.
Пад бярозаю – ручай.
А завецца Беларуссю
Непаўторны родны край! *Артур Вольскі*

Мяжуе з Польшчай, Украінай,

Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына –
Жыццё тваё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла – Беларусь! *Юрась Свірка*

Залатыя стужкі
на бярозцы мілай.
Хутка, хутка птушкі
Паляцяць у вырай. *Васіль Жуковіч*

Не забівай пчалу і краску,
Усё жывое хоча жыць!
Цані прыроду, калі ласка,
І для нашчадкаў зберажы! *Васіль Жуковіч*

Я слаўлю мамы светлае імя – пяшчотнае, нібыта яблынь квецень.
Матулінага сэрца цеплыня нас сагравае лепш за ўсё на свеце. *Васіль Зуёнак*

Калі трымае маці на руках
Свайго малога, мне здаецца – маці
Трымае чалавецтва, што ў вяках
Жыве, як светлы дух у гэтай хаце. *Васіль Зуёнак*

Век дзяліся тым, што маеш, -
Хлебам-соллю, казкай-краскай.
Ну а ў госці запрашаеш,гавары ўсім:
- Калі ласка!
- А з табой як тое будзе,
То за шчодры знак усякі
Пакланіся добрым людзям

І скажы ім шчыра:

- Дзякуй! *У. Паўлаў*

**Дадатак 2**

**Тэматычны слоўнік**

**Ветлівыя словы:** добры дзень, дзякуй, калі ласка, да пабачэння, прашу прабачэння, выбачайце.

**Школа:** верасень, вучань, настаўніца,дырэктар, бібліятэкар, бібліятэка, спартыўная зала, настаўніцкая, сталовая, калідор, спартыўная пляцоўка, класнае памяшканне, дзяжурныя, перапынак.

**Школьныя прылады:** партфель, рукзак, аловак, гумка, пенал, сшытак, ручка,фламастары, фарбы, пэндзлік, крэйда,дошка, падручнік.

**Мае сваякі:** сваякі, бацькі, маці, матуля, бацька, тата, дзед, дзядуля, бабуля, унук, унучка, дачка, дачушка,сын, сынок, брат, сястра.

**Рэжым дня:** рэжым, ранішняя зарадка, гадзіннік, гадзіна, час, хвіліна, снеданне, абед, падвячорак, вячэра, праца, адпачынак, гульня.

**Мая кватэра:** квартіра, пакой, столь, сцяна,вокны, дыван, канапа, ложак,калідор, шафа, тэлефон, люстра.

**Асабістая гігіена:** мыла, расчоска, грэбень, люстэрка, насоўка, ручнік, расчэсваць валасы, мыць рукі, выціраць твар, чысціць зубы, праціраць вочы.

**Адзенне і абутак:** адзенне, штаны, брукі, пінжак, кашуля, чаравікі, спадніца, боты,сукенка, хустка, капялюш, паліто, камізэлька, шалік, гузік, кішэня.

**Заняткі ў вольны час:** чытаць кніжку, апранаць ляльку, гуляць у цацкі, маляваць алоўкамі, ляпіць снежную бабу, катацца на санках(лыжах, каньках), гойдацца на арэлях, складваць кубікі,будаваць дом з пяску, глядзець тэлевізар.

**Дзень нараджэння:** адзначаць дзень нараджэння, запрашаць сяброў, ветлівыя госці, віншаваць імяніміка, дарыць падарункі, белы абрус, смачны пірог, варэнне, ласункі, частаваць пячэннем, падаць кубак чаю, святочны настрой.

**Хатнія клопаты:** клопат, турботы, абавязак, памочнік (памочніца), гаспадар (гаспадыня), праціраць пыл анучкай, пыласосіць дыван, падмятаць смецце з падлогі, прасаваць бялізну, мыць посуд, паліваць кветкі, каміць шчаня(кацяня).

**У краме:** крама, гастраном, пакупнік, прадавец, чарга, грошы,разлічвацца, рэшта, каштуюць, прадукты, цукар, смятана, малако, вяршкі, сметанковае масла, каўбаса, хлеб, сыр, яйкі, цукеркі, пернікі, пячэнне, мяса, рыба, сала, соль, мука, алей, макароны, крупы, кава, гарбата.

**На пошце:** пошта, паштальён, віншавальная паштоўка, выпісаць часопіс, адправіць тэлеграму, напісаць ліст, свежая газета, атрымаць пасылку, прыклеіць марку на канверт.

**З'явы прыроды:** маланка, навальніца, гром, дождж, вецер, сонца, промні, вясёлка, імжа, туман, снег, завіруха, мяцель, мяцеліца, бура, град.

**Звяры Беларусі:** алень, бабёр, барсук, воўк, вавёрка, вожык, выдра, дзік, заяц, зубр, казуля, крот, куніца, ліса, лось, мядзведзь, мыш, рысь,тхор, янот.

**Птушкі Беларусі:** верабей, варона, бусел,галка, голуб, гусь, глушэц, грак, дрозд, дзяцел, журавель, жаваранак, зязюля, качка, крумкач, каршун, кнігаўка, кулік, курапатка, ластаўка, малінаўка, перапёлка, сава, салавей, сойка, сарока, сініца, стрыж, цецярук, шчыгол, шпак, чайка, чыбіс,чыж, чапля.

**Дадатак 3**

**Урок беларускай мовы у 3 класе**

**<u>Тэма:</u>** Галоўныя члены сказа

**<u>Мэта</u>:** фарміраванне паняцця пра сувязь слоў у сказе, пра значэнне галоўных членаў сказа.

**<u>Задачы</u>:** пазнаёміць з графічным абазначэннем галоўных членаў сказа; вучыцца вызначаць галоўныя члены ў сказе;спрыяць развіццю звязнай вуснай і пісьмовай мовы вучняў, арфаграфічнай пільнасці, псіхічных працэсаў;узбагачаць слоўнікавы запас вучняў;выхоўваць беражлівыя адносіны да навакольнага свету, да птушак.

**<u>Абсталяванне:</u>** запісы на дошцы; падручнік “Беларуская мова. 3 клас” Т. М. Валынец; выявы і назвы птушак Беларусі; табліца-схема “Галоўныя члены сказа”; медыяпраектар.

**<u>Ход урока</u>**

| ***Змест урока*** | ***№ слайда*** |
|---|---|
| 1. **Арганізацыйны момант**. (Настаўнік чытае верш з клічнай інтанацыяй.)<br>Празвінеў званок вясёлы,<br>У клас пазваў усіх сяброў!<br>Будзем дружна працаваць,<br>Будзем веды набываць!<br>- Жадаю вам плённай працы на ўроку! | ***2*** |
| **2. Актуалізацыя ведаў**<br>- Ці дапамагло маё прывітанне ўспомніць тэму прошлага ўрока? (*Клічныя сказы*)<br>- Чым цікавыя клічныя сказы? (*У клічны сказ можа ператварыцца любы сказ, калі яго вымавіць з асаблівым пачуццём.)*<br>- Ці падняўся ў вас настрой? Чаму? (*Таму што верш прачыталі з асаблівым пачуццём радасці).*<br>- Якія сказы па мэце выказвання ператварыліся ў клічныя? (*Апавядальны і пабуджальны.*) | ***2*** |
| **3. Праверка дамашняга задання.**<br>- Для таго, каб добра зразумець наступную тэму, трэба праверыць веды, якія мы ўжо атрымалі. Пакуль мы праверым дамашняе заданне, рабяты 3 рада будуць працаваць у парах, пісаць **ўзаемадыктант**. | |

<table>
<tr><td>- Паглядзіце на словы, якія змешчаны ў вас на картках, і адкажыце: на якое яны правіла ? (Правапіс парных звонкіх і глухіх зычных).<br>- Як трэба правяраць напісанне парных звонкіх і глухіх зычных?<br>- Прадыктуйце адзін аднаму словы , надрукаваныя на картках, па чарзе: сцежка, ягадка, бярозка, лыжка, гарбуз, дождж, вузкі, адказ, горад, круг.<br>- А зараз праверым, як вы выканалі дамашняе практыкаванне № 135 .</td><td></td></tr>
<tr><td>4. Хвілінка чыстапісання.<br>- Якая арфаграма зашыфравана ў чыстапісанні? ЕЁ-Я е,ё-я (Правапіс галосных літар е,ё-я)<br>- Калі ў беларускай мове галосныя е,ё пераходзяць у я?<br>- Прапішам радок чыстапісання: Е,Ё – Я е, ё – я Яўген Яніна яліна<br>- Што цікавага вы заўважылі?(Словы <u>яліна і Яніна</u> адрозніваюцца адным гукам, ва ўсіх словах гукаў больш, чым літар, таму што літара я ў пачатку слова абазначае два гукі. )</td><td>3</td></tr>
<tr><td>5. Вызначэнне тэмы ўрока.<br>- Прачытайце словы на дошцы, выпішыце тыя, ў напісанні якіх трэба прымяняць правіла правапісу галосных е,ё-я, і вы даведаецеся, над чым мы будзем працаваць на ўроку. (Адзін вучань ля дошкі,ставіць націск у словах, падкрэслівае патрэбныя галосныя з каменціраваннем, астатнія вучні працуюць у сшытках)<br><u>Бусел, цецярук,</u> салавей, <u>верабей,</u> чапля, журавель, <u>зязюля</u>.<br>- Прачытайце слова, запісанае чырвонымі літарамі.<br>
<table>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td>б</td><td>у</td><td>с</td><td>е</td><td>л</td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>ц</td><td>е</td><td>ц</td><td>я</td><td>р</td><td>у</td><td>к</td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td>в</td><td>е</td><td>р</td><td>а</td><td>б</td><td>е</td><td>й</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td>з</td><td>я</td><td>з</td><td>ю</td><td>л</td><td>я</td></tr>
</table>
-Што такое сказ?<br>-А вы ведаеце, як нараджаецца сказ?<br>-Сёння на ўроку мы працягнем атрымліваць веды па тэме “Сказ”</td><td>4<br><br>5</td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
| і даведаемся, як нараджаецца сказ і з чаго ён складаецца.  А дапамогуць нам нашы пярнатыя сябры.<br>-Каго называюць пярнатымі сябрамі? (*Птушак*)<br>-Пазнаёмімся з птушкамі, назвы якіх мы ўжо запісалі. | |
| **6. Слоўнікавая работа.**<br>- Хто ведае, як падае голас зязюля? (к*у-ку*) Верабей? (*чык-чырык*) Сініца? (*цінь-цінь*) Варона? (*кар-кар* ) Бусел? (*трышчыць*)  Жаваранак?...(*звініць*)<br>- Як вы думаеце, якую літару трэба пісаць у слове **зв_ нець** ?<br>- Гэта слоўнікавае слова, і ў ім пішацца галосная і.<br>- Што трэба зрабіць, каб лепш запомніць правапіс гэтага слоўнікавага слова? (*Запісаць, разабраць*)<br>- Запішам яго, паставім націск.<br>- Колькі складоў у слове? Запішам, падзяляючы на склады.<br>- Якую літару трэба запомніць? Падкрэслім яе.<br>- Якую арфаграму яшчэ мы бачым у слове? (Правапіс зычных т-ц.)<br>- Чаго ў слове больш: гукаў ці літар? (Літар больш, чым гукаў.)<br>-  Што мы можам сказаць пра зычныя гукі ў слове? (Яны ўсе мяккія.). | ***6*** |
| **7. Адкрыццё  новых ведаў.**<br>- Ці чулі вы калі небудзь, як спявае жаваранак? Гэтая невялічкая шэрая птушачка падае свій звонкі галасок высока ў небе, абвяшчаючы ўвесь свет аб тым, што наступіла.......*(вясна).*<br>- А зараз давайце складзем і запішам прыгожы сказ з гэтым словам.<br>- Мы будзем складаць апавядальны  няклічны сказ, каб у ім гаварылася пра птушку жаваранка. (Каменціраванае пісьмо на дошцы).<br>-Хто?   Што робіць?   Дзе?<br>- Жаваранак звініць высока ў небе. Вось і нарадзіўся сказ.<br>- З якога слова пачалося яго нараджэнне?<br>- Што паказвае слова жаваранак? (*Аб чым гаворыцца ў сказе.*)<br>- Гэты член сказа называецца **дзейнік**. Як вы думаеце, чаму? (*Гэты член сказа выконвае нейкае дзеянне.)* | |

| | |
|---|---|
| -Да якога слова мы ставім пытанне далей? Звініць. Што яно паказвае ў сказе? Гэты член сказа называецца **выказнік.** Чаму?<br>- Дзейнік і выказнік называюцца **галоўнымі членамі сказа**.<br>- Як вы думаеце, чаму?<br>- Ці будуць лішнімі іншыя члены сказа? Чаму? (У кожнага слова ў сказе ёсць свая роля , яны дапаўняюць галоўныя члены. )<br>- Вось мы і даведаліся аб тым, як нараджаецца сказ.<br>**Падвядзем вынікі.** Якія члены сказа галоўныя? Чаму яны галоўныя? Акрамя іх ёсць іншыя члены сказа.Ці можна да іх паставіць пытанне ад галоўных членаў? А ці можна паставіць пытанне да слова ў? Зрабіце выснову, ці з'яўляецца гэта слова членам сказа? (*Не* )<br>-Раскажыце адкрытае вамі правіла па схеме-апоры . | *7* |
| **8. Фізкультхвілінка. Гульня "Лятае – не лятае" - паказаць рухамі. (Развіццё фанематычнага слыху)**<br>Суніца, сініца, зязюля, цыбуля, ластаўка, лаўка, вузел, бусел, грак, рак, чайка, зайка, журавель, карабель. | ***8*** |
| **9. Першапачатковае замацаванне.**<br>- А вы ведаеце, рабяты, хто самы лепшы сябра птушак?<br>- У такім выпадку прачытаем тэкст "Сябры птушак"<br>Снег пакрыў зямлю. Галадаюць зімой снегіры і сініцы. Школьнікі дапамагаюць птушкам выжыць. Зімой дзеці ставяць кармушкі.<br>-Дык хто ж птушыныя сябры? Чаму іх так называюць?<br>- А вы – птушыныя сябры? Чаму трэба зімой падкормліваць птушак?<br>-Растлумачце арфаграмы ў словах гэтага тэкста.<br>-Ой, дзеці, глядзіце, які снегапад! Снежныя камякі заляпілі часткі слоў. Вам трэба "расчысціць" сказы і запісаць іх так, як было.<br>-Зрабіце ўзаемаправерку, памяняйцесь сшыткамі і выпраўце памылкі.<br>-Знайдзіце і падкрэсліце галоўныя члены сказа : 1 варыянт у першым сказе, 2 варыянт – у апошнім сказе. Праверце. | ***9***<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>***10*** |
| **10. Замацаванне па падручніку.** Пр. 140 | |

| | |
|---|---|
| - Прачытайце назву тэкста. Якія птушкі могуць жыць на беразе возера? (Чайкі, качкі, чаплі, лебедзі, гусі)<br>- Як вы разумееце выразы *гамоняць сосны, люстраная вада, возера маўчыць?*<br>-Давайце прачытаем тэкст , прагаворваючы словы па складах – арфагрфічна. Для чаго мы гэта зробім? (Каб падрыхтавацца да дыктанта).<br>-А зараз запішам першыя два сказы пад дыктоўку.<br>Самастойна падкрэсліце галоўныя члены сказа. Абвядзіце ў кружок словы, якія не з’яўляюцца членамі сказа. | ***11*** |
| **11. Падвядзенне вынікаў. Тэст-дапаўненне**<br>● Словы, з якіх складаецца сказ… *(члены сказа)*<br>● Галоўны член сказа, які абазначае, пра што ці пра каго гаворыцца ў сказе… (*дзейнік*)<br>● Галоўны член сказа, які абазначае, што гаворыцца пра дзейнік… (*выказнік)*<br>● Дзейнік адказвае на пытанні… *(хто? што?)*<br>● Выказнік адказвае на пытанне*…(што рабіць?)*<br>● Дзейнік падкрэсліваем…. (*адной рыскай)*<br>● Выказнік падкрэсліваем *…(двума рыскамі)* | ***12*** |
| **12. Дамашняе заданне:** прачытаць прав. с. 80-81, пр. 141 або 144. | ***13*** |
| **13. Рэфлексія.**<br>- Ці спадабаўся вам урок? Што вас здзівіла? Што зацікавіла?<br>- Аб чым яшчэ захацелася даведацца?<br>Птушкі нашага краю развітваюцца з вамі.<br>Усе птушкі Беларусі: качкі, і буслы, і гусі,<br>І сарокі, і саколкі,чаплі, совы, перапёлкі,<br>Каршуны, сіваваронкі, і шчыглы, і жаваронкі,<br>Крумкачы, галкі, вароны, галубочкі нахахлёны, | ***14*** |

| | |
|---|---|
| Дзятлы, чыжыкі, зязюлі, кулікі, сяўцы, жаўнулі.<br>Жаблы і шпакі , цяцеры, курапаткі, пер’ем шэры,<br>Ластаўкі і верабейкі, і сініцы, салавейкі,<br>І глушцы жа і удоты, што лятаюць без ахвоты.<br>Над ракамі, ля вадзіцы чайкі, чыбісы, пігліцы,<br>І вядуцца на балотах жураўлі ў густых чаротах.<br>Хто сакоча, хто кудахча, хто па стрэсе спрытна скача,<br>Хто па кусціках у садочку, хто на полі, у лясочку…<br>Ці ўлетку, ці прадвесняй  слухаць міла іхні песні. *Алесь Гурло* | |

**Дадатак 4**

**Лексічныя хвілінкі**

*Гульня “Знайдзі чацвёртае лішняе”*

-чарніцы, ажыны, суніцы, нажніцы;

-пернікі, дранікі, вейкі, аладкі;

- бурак, булён, бульба, кроп.

*Гульня ”Слова заблудзілася”*

- весела, вясёлы, вяселле, вясло;

-вада, вадавоз, водар, водны;

-верасень, верас, верацяно, вераснёвы;

-школьнік, шкло, шкляны;

-мёд, мядовы, медны, мядок;

*Гульня “Замяні адным словам”*

У дупле жывуць вавёрка, <u>мядзведзь</u>, сава, дзяцел. (Дзеці знаходзяць замест слова “мядзведзь”, напрыклад, слова “восы” або “пчолы”).

Мама прынесла з крамы цукар, крупы, алей, <u>шафу,</u> макароны.

*Гульня “Адзін - многа” , “Многа-адзін”*

Сцяг – сцягі, вядро – вёдры, гняздо – гнёзды, воўк – ваўкі, вецер – вятры, вечар – вечары, бераг – берагі, горад – гарады.

Шафы – шафа, кішэні – кішэня, відэльцы – відэлец, туфлі- туфель, галёшы – галёш, яблыкі – яблык.

Сані, кросны, вілы, акуляры, граблі.

*Гульня "Назаві адным словам"*

Шпак, бусел, качка (птушкі)

Сукенка, спадніца, футра (адзенне)

Вожык, вавёрка, дзік (дзікія звяры)

Чаравікі, боты, галёшы (абутак)

*Гульня "Падбяры аднародныя члены сказа"*

Над кветкамі закружыліся_____, _____, _______. (чмялі, матылькі, пчолы)

Тата злавіў у рацэ _____, ____, _____. (карася, шчупака, акуня)

*Гульня "Падбяры слова, блізкае па значэнню"*

Ідзе - …(крочыць), імчыцца - …(бяжыць), чысты - …(памыты), трошкі - …(крыху), брудны - …(неахайны) і г.д.

*Гульня "Падбяры слова, процілеглае па значэнню"*

Дзень- …, зіма - …, глыбока - …, шырокі - …, ідзе - … і г. д.

*Гульня "Падбяры прыметнік з процілеглым значэннем"*

Яблык – лімон (Яблык салодкі, а лімон кіслы)

Воўк – заяц (Воўк смелы, а заяц баязлівы)

Гульня *"Слова збегла"*

У гэтай гульні трэба дапоўніць сказ недастаючым па сэнсу словам.

Мама ________ на снеданне кашу. На агародзе______ вялізны гарбуз.

**Дадатак 5**




**Дадатак 6**

## Спіс публікацый

1. Сямёнава, А.А. Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа. Урок у III класе школ з рускай мовай навучання / А.А. Сямёнава //Пачатковая школа. – 2013. - №9. – С. 6-7.